**Аксана Кузоўкіна**

**Метадыст Цэнтральнай бібліятэкі
імя А.С. Пушкіна г. Мазыра**

# МОДА НА КРАЯЗНАЎСТВА

Мы, бібліятэкары, – людзі сучасныя: як і многія, сочым за павевам моды ў розных яе праявах. І з вялікай радасцю хочам адзначыць, што сёння модным стала... краязнаўства. Вывучаць гісторыю малой радзімы, стварыць сваё генеалагічнае дрэва, папоўніць прабелы ў веданні роднай мовы, чытаць беларускую літаратуру – вось да чаго імкнуцца многія нашы суайчыннікі.

А хто, як не бібліятэкі, могуць дапамагчы ўсім зацікаўленым падабраць неабходную інфармацыю, параіць патрэбную кнігу!

Менавіта таму краязнаўства з'яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці Цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна горада Мазыра, якая прадугледжвае арганізацыю сустрэч з мясцовымі аўтарамі, правядзенне прэзентацый новых кніг, выпуск бібліяграфічных дапаможнікаў для раскрыцця краязнаўчага фонду, папулярызацыю літаратуры Мазыршчыны.

Кнігі пісьменнікаў-землякоў вельмі запатрабаваныя і заўсёды знаходзяць жывы водгук сярод нашых чытачоў. Яны прывіваюць любоў і павагу да гісторыі і культуры роднага краю, дапамагаюць паўней адчуць і ўсвядоміць сувязь літаратуры з жыццём, пашыраюць і ўзбагачаюць веды аб родных месцах.




Вялікая цікавасць да краязнаўства, у тым ліку краязнаўства літаратурнага, ініцыявала стварэнне і рэалізацыю інтэрнэт-праекта «Ні дня без думкі аб родным краі». Ідэя праекта – рэгулярнае размяшчэнне на сайце бібліятэчнай сістэмы аўдыёзапісаў вершаў мазырскіх паэтаў, прачытаных супрацоўнікамі бібліятэкі. Выйсці за межы бібліятэчнай аўдыторыі з дапамогай віртуальнай прасторы, пераадолець культурную ізаляцыю розных сацыяльных груп, актывізаваць чытацкі інтарэс да рэгіянальнай літаратуры – так можна ахарактарызаваць мэты і задачы, якія мы паставілі перад сабой.

Пачалася наша праца над рэалізацыяй праекта са складання спісу літаратуры для агучвання. Праглядаліся калектыўныя зборнікі, аўтарскія кнігі, перыядычныя выданні, адкуль адбіраліся паэтычныя творы, у якіх згадваецца Мазыр, вёскі Мазырскага раёна, рака Прыпяць, апісваецца наша прырода і распавядаецца пра выдатных мазыран.

Стварыць творчую групу з ліку супрацоўнікаў Цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна было зусім не цяжка, таму што кожнаму бібліятэкару захацелася паспрабаваць свае сілы на новай ніве – у ролі дыктара, акцёра агучкі. Своеасаблівы кастынг праходзіў у нязмушанай абстаноўцы. Трэба адзначыць, што з першага разу прачытаць верш выразна, без памылак удалося не кожнаму. Таму для паляпшэння вынікаў вырашана было праводзіць рэгулярныя рэпетыцыі.

Першыя аўдыёзапісы з'явіліся на сайце бібліятэчнай сістэмы 15 верасня 2016 г. І гэта не выпадкова, таму што старт праекта з самага пачатку быў прымеркаваны да некалькіх падзей – Дня бібліятэк і Дня горада Мазыра. Анансавалі мы свой праект праз сродкі масавай інфармацыі, сайт мазырскага райвыканкама, размяшчалі афішы ў бібліятэках раёна, на вуліцах горада.

На сённяшні дзень на сайце размешчана 60 вершаў на беларускай і рускай мовах 34 аўтараў. Тут і масцітыя паэты, вядомыя ў Мазыры і за яго межамі, і паэты-аматары.

Спадзяемся, што наш праект таксама дасць пэўныя вынікі: знаёмства гараджан з творчасцю мазырскіх паэтаў, рост цікавасці сярод мазыран да культурнай спадчыны роднага краю, павялічэнне колькасці віртуальных карыстальнікаў.

Што тычыцца тэрмінаў рэалізацыі праекта, мы вырашылі абмежавацца пяццю гадамі – да 2020 г. Але хочацца верыць, што на працягу гэтага часу наш спіс вершаў пра Мазыр будзе папаўняцца. Тым больш, што ёсць планы пашырыць праект: даць магчымасць аўтарам самім чытаць свае паэтычныя творы для запісу. Ды ці мала якія ідэі наведаюць нас яшчэ! Абяцаем, што абавязкова з вамі падзелімся!

Summary

Poetic local history project of Mozyr Central Library named A.S. Pushkin.